Інклюзія

# Ван Гог, «Зорная ноч» і... прынясце людзей з аўтызмам

## «Зорную ноч» ван Гога «запаляць» мінчане ў рамках акцыі Light It Up Blue



**2 красавіка ва ўсім свеце праходзіць акцыя ў падтрымку Сусветнага дня інфармавання аб праблеме аўтызму Light It Up Blue. У гэты дзень сінім колерам падсвятляюцца славутасці і арт-аб'екты. Адмысловая акцыя пройдзе і ў беларускай сталіцы: яе жыхарам будзе прапанавана стаць суаўтарам карціны ван Гога.**

Актыўнасць у рамках Сусветнага дня інфармавання аб праблеме аўтызмуператворыцца ў паўнавартасную мастацкую падзею: побач з гарадской ратушай будзе ўстаноўлена канструкцыя з рэпрадукцыяй карціны Вінсента ван Гога «Зорная ноч», а ўсе ахвотныя змогуць унесці свой сімвалічны ўклад у правядзенне акцыі і «запаліць» на маляўнічым небасхіле сваю ўласную зорку. Для гэтага неабходна проста атрымаць у арганізатараў святлодыёдную лямпачку і размясціць яе на канструкцыі. Калі ўсе святлодыёдныя лямпачкі зоймуць сваё месца, палатно ван Гога «ажыве».

Акцыя пройдзе 2 красавіка з 18.00 да 23.00 каля гарадской ратушы па ініцыятыве сямейнага інклюзіўтэатра «і» пры падтрымцы кампаніі velcom.

Вінсент ван Гог — знакаміты нідэрландскі мастак XIX стагоддзя, аўтар карцін «Зорная ноч», «Начная тэраса кафэ», «Касачы» і іншых. На думку некаторых даследчыкаў, у творчасці і біяграфіі геніяльнага жывапісца прасочваюцца прыкметы расстройства аўтыстычнага спектра. І той факт, што самая вядомая яго карціна стане ў Беларусі сімвалам Сусветнага дня інфармавання аб праблеме аўтызму, — важны крок да прыняцця людзей з аўтызмам і выстройвання інклюзіўных адносін у грамадстве.

У падтрымку Сусветнага дня інфармавання аб праблеме аўтызму таксама пройдзе прэм'ера новага спектакля сямейнага інклюзіў-тэатра «і» — «Восем пачуццяў, або Нараджэнне чалавека». Першы паказ пастаноўкі адбудзецца ў Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў.

У трупу сямейнага інклюзіў-тэатра «і» ўваходзяць дзеці і іх бацькі, у тым ліку дзеці з аўтызмам. Творчая атмасфера дапамагае студыйцам развіваць навыкі зносін і ў камфортнай абстаноўцы пераадольваць цяжкасці, звязаныя з дыягназам. Дзеці вучацца харэаграфіі, пластыцы, вакалу, акцёрскай ігры. Пры падтрымцы velcom тэатр паставіў ужо пяць спектакляў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# СОНЕЧНА І ЦЁПЛА

## Але ўначы сіноптыкі абяцаюць замаразкі

**На гэтым тыдні будзе стаяць сапраўды вясновае надвор'е. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе дасягаць плюс 15 градусаў, у той жа час уначы стане вымарожваць да мінус 6 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У першыя дні красавіка надвор'е вызначыць антыцыклон. Таму на працягу рабочага тыдня ападкаў не чакаецца, а па начах будзе падмарожваць. Затое ўдзень, пры малавоблачным надвор'і, паветра стане істотна прагравацца.

Сёння ўдзень умовы надвор'я на тэрыторыі краіны будзе вызначаць антыцыклон, сфарміраваны ў халоднай паветранай масе. Дажджоў не прадбачыцца. Тэмпература паветра па краіне ўдзень будзе ад плюс 7 да плюс 12 градусаў. У сераду і чацвер таксама чакаецца без ападкаў, удзень у заходніх раёнах будзе дзьмуць парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, ва ўсходніх раёнах краіны месцамі паветра ахалодзіцца да мінус 6 градусаў. Удзень прагназуецца ад плюс 8 да плюс 13 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 14—15 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да плюс 2 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны яна не апусціцца ніжэй за 4 цяпла. Удзень жа сонца прыгрэе і будзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**




• Першую частку праектна-каштарыснай дакументацыі па недабудаваным жылым комплексе, забудоўшчыкам па якім раней выступала ТАА «Тамбаз», плануецца перадаць на экспертызу ў маі. Пра гэта паведаміў падчас прамой лініі старшыня Мінгарвыканкама Анатоль Сівак, перадае БелТА. Завяршэнне работ па даўгабудзе па-ранейшаму застаецца адным з актуальных пытанняў. На аб'ект распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя, якая затым павінна прайсці экспертызу. «Калі атрымаем дакументы, зможам казаць канкрэтна. Пасля абследавання дома стане вядомы памер даплат», — сказаў Анатоль Сівак. Ён паабяцаў, што сустрэнецца з дольшчыкамі, калі з'явіцца дакументацыя. Перад гэтым у гарвыканкаме пройдуць рабочыя нарады для абмеркавання ўсіх праблемных пытанняў, каб не было галаслоўных заяў.

• Да старшыні Мінгарвыканкама звярнулася жыхарка Цэнтральнага раёна, дачка якой з'явілася шматдзетнай маці. У заяўніцы аднапакаёвая кватэра, і малодыя бацькі вымушаныя здымаць кватэру. Адміністрацыя прапанавала некалькі варыянтаў вырашэння жыллёвага пытання, але яны сям'ю не задаволілі. Акрамя таго, банк адмаўляе жанчыне, якая знаходзіцца ў дэкрэце, у выдачы крэдыту. «Чаму нельга выкарыстоўваць мацярынскі капітал?» — пацікавілася яна. Анатоль Сівак паабяцаў вывучыць сітуацыю.

• Адзін са званкоў датычыўся дзейнасці грамадскага аб'яднання «Геном-Надзея» і недастатковай колькасці памяшканняў у сталіцы для дзённага знаходжання людзей з інваліднасцю. Акрамя таго, паступалі званкі па рэалізацыі інвестпраекта ў Мінску, уладкаванні паркоўвачных месцаў, дзейнасці партала 115.бел. Інвалід-калясачнік звярнуўся з просьбай удасканаліць безбар'ернае асяроддзе ў метрапалітэне.

• За тры гадзіны падчас прамой лініі было прынята звыш паўсотні званкоў. Усе звароты дэталёва вывучаць. Што датычыцца дзейнасці службы 115, то ў першым паўгоддзі плануецца ліквідаваць наяўныя недахопы.

Будзь у курсе!

# Па ягады — з камбайнам

**Пастанова Міністэрства ляснной гаспадаркі «Аб зборы дзікарослых ягад» ужо ўступіла ў сілу. Дакументам зацверджана інструкцыя аб спосабах і прыстасаваннях для збору і нарыхтоўкі дзікарослых ягад у лясным фондзе, якая ўключае патрабаванні да тэхналогій нарыхтоўкі дзікарослых ягад, паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса.**

Збіраць ягады дазваляецца ўручную альбо пры дапамозе ручных прыстасаванняў на дазволеных лясных тэрыторыях. Да нядаўняга часу выкарыстанне розных прыстасаванняў для збору дзікарослых ягад з'яўлялася незаконным, паколькі не было выразна ўстаноўленых патрабаванняў да такіх прылад. З уняўсеннем змяненняў у Лясны кодэкс Беларусі і прыняццем пастановы Мінлясгаса гэты прабел выпраўляецца. У інструкцыі дакладна прапісаны патрабаванні да прыстасаванняў для збору, нарыхтоўкі дзікарослых ягад у лясным фондзе, якія не прыносяць шкоды ягаднікам і не прыводзяць да іх знішчэння.

У прыватнасці, у п. 7 пастановы прапісана, што прыстасаванне для збору дзікарослых ягад складаецца з зубоў, ёмістасці назапашвальніка, трымальніка (ручак) і адпавядае наступным патрабаванням: адлегласць паміж зубамі складае не менш за 0,5 сантыметра, корпус прыстасавання і зубы вырабляюцца з пластмасы, металу, драўніны, гумы або іх камбінацыі, у прыладах адсутнічаюць рэжучыя краі ў зоне зрывання ягад. Гэтыя патрабаванні былі распрацаваны для недапушчэння пашкоджання частак пабегаў дзікарослых раслін, а патрабаванні да матэрыялаў прыстасаванняў былі ўстаноўлены, зыходзячы з вопыту іншых краін і магчымасцяў вытворцаў, расказалі ў прэс-службе.

У інструкцыі таксама прапісана, што пры зборы чарніц і буякоў прыстасаванне варта накіроўваць пад вуглом да верхняй часткі куста, прытрымліваць пабегі свабоднай рукой, пазбягаць траплення ў грабянец тоўстай ніжняй часткі пабегаў. Пры зборы журавін прыстасаванне неабходна накіроўваць па паверхні моху і пабегах журавін. Акрамя таго, грамадзянам рэкамендуецца весці збор толькі спелых ягад у перыяд іх масавага паспявання ў сухое надвор'е, пасля сходу расы, паколькі гэта зніжае верагоднасць абрыву лісця.

У Мінлясгасе звярнулі ўвагу, што збіраць ягады па новых правілах можна будзе ўжо з гэтага сезона.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗА ВЫХАДНЫЯ — 158 УЗГАРАННЯЎ ТРАВЫ І КУСТОЎ

**За гэты ж час у падраздзяленні МНС паступілі сігналы аб адным тарфяным пажары і двух узгараннях у лясах.**

Большая частка паведамленняў прыйшла з Брэсцкай і Мінскай абласцей. У суботу лясны пажар у Гродзенскай вобласці пачаўся з-за неасцярожнага спальвання смецця пенсіянеркай.

У Шумілінскім раёне з-за выпальвання сухой расліннасці агонь знішчыў два дамы і хлеў. Калі на месца прыбылі падраздзяленні МНС, будынкі гарэлі адкрытым полымем. Ніхто не пацярпеў. Уладальнікі дамоў адсутнічалі, паколькі пражывалі ў іншых населеных пунктах, а гэтыя выкарыстоўвалі ў якасці лецішчаў. Агонь знішчыў дахі, столевыя перакрыцці, сцены. Асноўная версія здарэння — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры выпальванні сухой расліннасці, паведамілі ў МНС. Па факце праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Прызнанне

# Фільм «Хрусталь» адзначаны нацыянальнай кінапрэміяй Расіі

**Карціна беларускага рэжысёра «Хрусталь», якая рэзанансна прагучала ў нашай кінапрасторы ў мінулым годзе, прызнана найлепшым фільмам краін СНД і Балтыі на цырымоніі ўручэння кінапрэміі «Ніка». Лаўрэаты прэміі Расійскай акадэміі кінематаграфічных мастацтваў былі трыццаць другі раз абвешчаны ў Маскве 30 сакавіка.**



У сваёй карціне Дар'я Жук паказала Беларусь 1990-х, дзе галоўная гераіня Вэля марыць з'ехаць у ЗША, але з Мінска трапляе ў беларускае мястэчка і захрасае ў рэчаіснасці. Фільм здымаўся ў капрадукцыі Беларусі, Расіі, Германіі і ЗША, а ў выніку стаў сапраўдным беларускім хітом, у тым ліку ў пракаце, што выклікаў шэраг дыскусій як пра сам фільм, так і пра нашы 90-я.

Дзеля вылучэння карціны на саіскание прэміі «Оскар» у намінацыі «Найлепшы фільм на замежнай мове» нават была адноўлена дзейнасць беларускага оскараўскага камітэта, праўда, у шорт-ліст прэміі «Хрусталь» у выніку не трапіў. Затое быў паказаны на дзясятках міжнародных кінафестываляў і забраў некалькі буйных узнагарод, у тым ліку Гран-пры Адэскага міжнароднага кінафестывалю і Гран-пры кінафестывалю ў Алматы.

«Нікай» таксама былі адзначаны Кірыл Сярэбранікаў з фільмам «Лета» (найлепшы рэжысёр), Аляксей Фядорчанка з карцінай «Вайна Ганны» (найлепшы фільм), а прэмію «За гонар і годнасць» гэтым разам атрымаў легендарны грузінскі і савецкі аўтар Атар Іаселіяні.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**